2. *Козлова, Н. Н.* Методология анализа человеческих документов / Н. Н. Козлова // Социологические исследования. – 2004. – №. 1. – С. 14–26.

3. *Bowen, G. A.* Document analysis as a qualitative research method / G. A. Bowen // Qualitative research journal. – 2009. – Vol. 9, № 2. – P. 27–40.

4. *Tyszkiewicz, E.* Obrazy domowego pożycia na Litwie / E. Tyszkiewicz. – Warszawa : Skład główny w księgarni Michała Glücksbërga, 1865. – 180 s.

5. *Tyszkiewicz, E.* Obrazy domowego pożycia na Litwie. Poszet drugi / E. Tyszkiewicz. – Kraków : Wytłoczono u Władysława Jaworskiego, 1867. – 97 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л. К. КУХТО,
М. М. САКАЛОЎСКАЯ

# БЕАТА ТЫШКЕВІЧ – ЗОРКА СУСВЕТНАГА КІНЕМАТОГРАФА

Вядомаму літаратурнаму крытыку, публіцысту, пісьменніку XIX ст. Ф. Булгарыну (1789–1859), які нарадзіўся ў маёнтку Пырашава на Міншчыне, належыць наступнае выказванне: «Домашнее музицирование было настолько распространено в Беларуси, что практически в каждом шляхетском доме имелись в наличии музыкальные инструменты, исполнялась вокальная и инструментальная музыка, в каждом шляхетском доме занимаются музыкой. Почти каждая бедная шляхтяночка в то время играла на польской гитаре (с семью железными струнами), на арфе и даже на гуслях, которые были тогда в большом употреблении» [1, с. 76].

Сучасныя беларускія мастацтвазнаўцы А. Л. Капілаў и А. І. Ахвердава таксама адзначаюць, што «любительским музицированием постоянно занимались в поместьях Буйницких, Нитославских и Корвин-Круковских на Витебщине; Стефановичей, Монюшек, Прозоров, Ельских, Рокицких, Завишей, Миладовских, Тышкевичей – на Минщине; Сапег, Тизенгаузов, Юндилов – на Гродненщине» [2, с. 11].

Даследаванне грамадска-палітычнай, навукова-творчай дзейнасці прадстаўнікоў графскай лініі Тышкевічаў дае падставу сцвярджаць, што іх рэзідэнцыя Лагойск на працягу некалькіх стагоддзяў з’ўлялася своеасаблівым музычным цэнтрам. Гас-

падары палацава-паркавага комплексу часта арганізоўвалі тут камерныя і сольныя канцэрты. У палацы заўсёды гучала музыка Агінскага, Манюшкі, Гайдна, Моцарта, творы іншых беларускіх і замежных кампазітараў. Граф Пій Фларыянавіч сябраваў з вядомым кампазітарам XIX ст. Восіпам Казлоўскім, кампазітарам і піяністам Фларыянам Міладоўскім. Частым госцем у Лагойску быў і такі слынны мастак і музыка, як Напалеон Орда, які, дарэчы, пакінуў замалёўку Лагойскага палаца. Да таго ж сам Пій Фларыянавіч цудоўна граў на скрыпцы і флейце. Аматарамі інструментальнай музыкі з'яўляліся і яго сыны – Канстанцін і Яўстахій (аб іх грамадскай і навуковй дзейнасці ўжо распавядалася на старонках зборніка).

Нашчадкам графскага роду Тышкевічаў, якія сёння пражываюць у Англіі, Канадзе, ЗША, Польшчы, Францыі і іншых краінах, перадалося захапленне музычна-тэатральным мастацтвам. Напрыклад, праслаўленым кампазітарам мінулага стагоддзя з'яўляўся Ян Тышкевіч.

Самай папулярнай актрысай 1960-х – 1970-х гг. у Савецкім Саюзе і Заходняй Еўропе была Беата Тышкевіч. Яна нарадзілася ў графскай сям'і ў прадмесцях Польшчы – Вілянове. Яе бацька Кшыштаф Тышкевіч – нашчадак старажытнага гербавага роду Лявіва. Маці – з роду вядомых князёў Патоцкіх. Бацькі Беаты пазнаёміліся ў Кракаве падчас вучобы ў Сельскагаспадарчай акадэміі. У дзяцінстве маленькая княжна выхоўвалася ў атмасферы раскошы і арыстакратызму. Усё нечакана змяніла вайна. Палац, у якім жылі Тышкевічы, быў заняты нямецкімі акупантамі, сям'я вымушана была перабрацца ў невялічкую кватэрку. Граф Тышкевіч стаў удзельнікам Супраціўлення, Варшаўскага паўстання. Падчас жорсткай расправы з паўстанцамі яму ўдалося эмігрыраваць у Англію, дзе ён і застаўся назаўсёды. Беата з братам і маці апынуліся ў лагеры бежанцаў у Прушкове. Пасля княжна трапіла ў жаночы манастыр у Міляноўцы. Пасля заканчэння вайны маці з непаўналетнімі дзецьмі вярнулася ў Варшаву, там яны арандавалі 12-мятровы пакойчык. Пазней славутая актрыса ўспамінала, што як і ўсе дзеці ваенных гадоў, яна спазнала голад, нястачу і рыззё. У пакойчыку не было ні ванны, ні ацяплення. Пачатковую адукацыю княжна атрымала ў спецшколе імя Н. Жмыхоўскай, ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метнасцю якой быў высокі ўзровень класічнай падрыхтоўкі. Сюды арыстакраты традыцыйна накіроўвалі вучыцца сваіх дзяцей.

Аднойчы ў школу, дзе вучылася Беата, завітаў асістэнт рэжысёра П. Камароўскі ў пошуках дзяўчыны на галоўную ролю ў кінафільме «Помста». Ён звярнуў увагу на сямнаццацігадовую прыгажуню і запрасіў яе на пробы, якія дзяўчына прайшла паспяхова. Беата была зацверджана на ролю Клары. У 1957 г. карціна з поспехам дэманстравалася ў еўрапейскіх і савецкіх кінатэатрах. Рэжысёр кінастужкі «Помста» параіў Беаце паступіць у Дзяржаўную вышэйшую школу ў Варшаве. Паспяхова здаўшы ўступныя іспыты, Беата становіцца студэнткай гэтай установы. Навучанне яна спалучала з акцёрскай дзейнасцю, здымалася ў эпізодах фільмаў «Агульны пакой», «Шкляная гара», «Візіты прэзідэнта» і інш. Адначасова працавала на тэлебачанні ў якасці асістэнта рэжысёра і вядучай праграмы «Размова аб кнігах» і тэлечасопіса «Не толькі для жанчын». Тут яе заўважыў рэжысёр В. Хас. Фільм Хаса «Агульны пакой», у якім знялася Беата (1959), рэзка змяніў лёс актрысы. Яе запрашаюць на галоўныя ролі такія сусветна вядомыя рэжысёры, як Анджэй Вайда, Тадэвуш Канвіцкі, Анджэй Жулаўскі, Агнешка Холанд, Ежы Антчак, Кшыштаф Занусі, Ежы Гофман, Януш Моргенштэрн і інш. Беата здымаецца ў лепшых кінастужках знакамітых рэжысёраў сусветнага кіно: Андрэ Дельво, Клод Лелуш, Жан Делануа, Клод Зідзі, Марта Месарош. Актрыса стварае незабыўныя вобразы ў тэлевізійных серыялах «Ночы і дні», «Вялікае каханне Бальзака», «Польскія дарогі», «Камедыянткі», зачароўваючы гледачоў сваім шармам, прыгажосцю і акцёрскім талентам. Падчас здымак вядомай кінастужкі «Самсон» (1961) Беата пазнаёмілася з рэжысёрам Анджэем Вайдам. Яны пасябравалі, працяглы час жылі ў грамадзянскім шлюбе. Свае адносіны яны ўзаконілі толькі ў канцы 1960-х гг.

Лёсаноснай у яе кар’еры стала стужка Аляксандра Форда «Першы дзень свабоды» (1964), дзе Беата выконвала галоўную ролю і цалкам праявіла свой талент. Яна бліскуча раскрыла псіхалогію маладой немкі, згвалтаванай падчас капітуляцыі Германіі замежнымі рабочымі. З такім жа акцёрскім майстэр-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ствам яна стварыла вобраз прынцэсы Альжбеты ў фільме А. Вайды «Попел» (1965). Карціна была прадстаўлена на галоўны прыз Канскага кінафестывалю, дзе яна зрабіла сапраўдны фурор у свеце кіно. Таксама з не меншым поспехам Беата выканала ролі Марыі Валеўскай у гістарычнай камедыі «Марыся і Напалеон» (1966) і арыстакраткі Ізабэлы Ленцкай у экранізацыі рамана Баляслава Пруса «Лялька». У гэты ж перыяд яна з поспехам здымалася ў бельгійскай стужцы «Чалавек, які коратка падстрыгаўся» (1966), у фільме Вайды «Усё на продаж» (1968). Гэтыя карціны прынеслі Беаце Тышкевіч заслужаную сусветную вядомасць і славу. Кінакрытыкі параўноўвалі яе з Сафі Ларэн і Ромі Шнайдар, захапляліся яе арыстакратызмам і тонкай манерай ігры.

Журналісты называлі Тышкевіч «славянскай Катрын Дэнёў», «зоркай пастановачных і касцюмных фільмаў», «славянскай Сафі Ларэн». Кінакрытыкі адзначалі, што Беата валодае выключным дарам вялікіх кіназорак, такіх як Ані Жырардо, Фэй Данаўэй. Гэта – асаблівы магнетызм, здольнасць ствараць выключную інтымную атмасферу, уздзейнічаць непасрэдна на гледача. Кожны жэст актрысы дакладны і завершаны, ніводнае слова не прагучыць без зместу, а створаныя жаночыя вобразы – мара кожнага мужчыны: яны спалучаюць жаноцкасць і цнатлівасць са спелым эратызмам, яны справядлівыя ў ацэнках; раскрываць таямніцы такой жанчыны – усё адно што разгадваць складаны дэтэктыў.

У росквіце кар'еры кінаактрысы разладзіўся яе шлюб з Анджэем Вайдам. Праўда, ім удалося захаваць сяброўскія адносіны. Пасля развітання, каб забяспечыць сябе і дачку, Беата шмат гастралюе, у працы яна ратавалася і ад дэпрэсіі. Асабістае жыццё зноў хутка наладзілася. Актрыса стала жонкай маладога рэжысёра, але і гэты шлюб аказаўся нетрывалым. Неўзабаве яна выпадкова сустрэлася з сябрам юнацкіх гадоў Яцэкам Падлеўскім, вядомым французскім архітэктарам. У падлеткавым узросце яны дамовіліся, што ўсё жыццё будуць разам. Аднак лёс распарадзіўся па свойму, іх дарогі разышліся на доўгія гады. І вось нечаканая сустрэча абудзіла пачуцці. Нягледзячы на тое, што Падлеўскі меў сям'ю і дзвюх дачок, Беата і Яцэк пабраліся шлюбам. Хутка нарадзілася і дачка Віка.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беата вымушана жыць паміж Варшавай і Марсэлем, бо старэйшая дачка і маці засталіся ў Варшаве. Пастаянныя пераезды з Францыі ў Польшчу адымалі шмат часу і сіл, перашкаджалі творчасці. І гэты шлюб не быў шчаслівым. Таленавітая актрыса вымушана была адна выхоўваць дачок, што некалькі стрымлівала яе творчасць, аднак яе прыродная прыгажосць і харызма не засталіся без увагі многіх рэжысёраў.

У палоне яе прыгажосці апынуўся і савецкі кінарэжысёр Андрон Канчалоўскі, старэйшы сын пісьменніка Сяргея Міхалкова, з якім у сярэдзіне 1960-х гг. Беата выпадкова пазнаёмілася ў Варшаве падчас презентацыі яго кнігі для дзяцей «Дзядзя Сцёпа». Гэтае знаёмства перарасло ў працяглае сяброўства. З Міхалковым нярэдка сустракаліся падчас наведвання Беатай Масквы, актрыса была частым госцем і ў радавым маёнтку Міхалковых на Ніколінай гары. Беата з пачуццём глыбокай павагі ставілася да ўсіх членаў сямейства Міхалковых. Яна захаплялася кулінарнымі здольнасцямі і рукадзеллем гаспадыні, мамы Мікіты і Андрона, якая сваёй кухняй уразіла нават знакамітага Ф. Феліні. Італьянскі рэжысёр і акцёр меў намер паўтарыць такі пачастунак сваім рымскім сябрам. Бэаце рабілі цудоўныя падарункі. Андрон Канчалоўскі нават прадаў свой раяль, каб набыць для актрысы калекцыйную філіжанку вырабу Кузняцоўскага фарфоравага завода ў выглядзе цудоўнай кветкі магноліі. А. Канчалоўскі прапанаваў Беаце зняцца ў яго кінастужцы «Дваранскае гняздо», дзе яна сыграла арыстакратку Варвару Лаўрэцкую, няверную жонку Фёдара Лаўрэцкага. Па меркаванні самой актрысы, гэтая роля – найлепшая ў яе кар’еры, вобраз гераіні атрымаўся жывым, поўным, з каханнем і расчараваннем. Аб такой ролі, сцвярджала Беата, марыць кожная актрыса.

Плённым было творчае супрацоўніцтва Тышкевіч і з іншымі савецкімі кінематаграфістамі. Працяглае сяброўства звязвала актрысу з Н. Міхалковым, В. Плотнікавым, В. Ціханавым, І. Глазуновым, А. Таркоўскім, С. Бандарчуком, І. Смактуноўскім, Л. Філатавым і інш. Так, яна здымалася ў палітычным дэтэктыве Ігара Госцева «Еўрапейская гісторыя», ваеннай кінастужцы «У жніўні 44-га…» пра групу шпіёнаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі вызваленай Беларусі, таксама ў асобных карцінах



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

славутага беларускага рэжысёра М. Пташука. У канцы 1970-х гг. актрыса радзей з’яўлялася на экране. Яе гераіні становяцца больш ураўнаважанымі і мудрымі. Ужо ў пачатку 1980-х гг. рэжысёры зноў запрашаюць яе здымацца ў тых ці іншых кінастужках. Праўда, гэта былі ролі другога плану, але фільмы карысталіся папулярнасцю ў гледачоў.

Не засталася актрыса без увагі і ў 2000-х гг. У гэты перыяд яна здымалася ў серыялах «У горы і радасці», «Магда М». Апошнімі працамі Беаты сталі карціны «Праведнік» (2015), дзе Тышкевіч сыграла графіню, і моладзевая камедыя «Стоднеўка», якая выйшла ў 2017 г.

Беата Тышкевіч мала выступала на тэатральнай сцэне. Яна выконвала асобныя ролі ў некалькіх спектаклях, калі рэжысёрам удавалася яе запрасіць. Так, Беата выконвала галоўную ролю ў спектаклі па Эрнесту Хэмінгуэю «За ракой, у цені дрэў», у спектаклі Хана Бакула па пісьмах знакамітай паэтэсы Агнешкі Асецкай, дзе роля гераіні напісана спецыяльна для Беаты Тышкевіч. Разам з вірлівым акцёрскім жыццём Б. Тышкевіч займалася актыўнай грамадскай дзейнасцю. На тэлебачанні яна вяла цыкл праграм, сярод якіх самымі папулярнымі былі «Справаздача па справе бяздомных дзяцей», ток-шоу «Якая ты на самай справе» з удзелам знакамітых жанчын – дзеячаў мастацтва, якія распавядалі аб сваіх жаночых праблемах. У газеце «Рабочая трыбуна» Тышкевіч вяла пастаянную рубрыку, дзе дзялілася сваімі ўражаннямі аб кінафільмах і вандроўках. Б. Тышкевіч з’яўляецца аўтарам аўтабіяграфічнай кнігі «Не ўсё на продаж». Шмат гадоў яна ўзначальвала Фонд польскай культуры, прадстаўляла краіну на шэрагу замежных форумаў. Як і многія яе папярэднікі з графскага роду Тышкевічаў, Беата адзначана высокімі ганаровымі званнямі і ўзнагародамі: «Срэбраная маска», «Рыцарскі крыж ордэна Адраджэння Польшчы», французскі ордэн Ганаровага легіёна, залаты медаль імя С. Ф. Бандарчука «За ўклад у сусветны кінематограф» і інш. Тышкевіч намініравана на званне «Самая папулярная актрыса Польшчы».

Цяпер Б. Тышкевіч жыве ў Варшаве, яна клапатлівая і чулая маці дзвюх дачок – Караліны і Вікторыі. Старэйшая Караліна ўжо атрымала юрыдычную адукацыю, нейкі час здымалася



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў кіно і рэкламе, была асістэнтам рэжысёра ў свайго бацькі А. Вайды. Малодшая Віка знайшла сябе ў эстрадным мастацтве, займаецца харэаграфіяй, спевамі, танцамі, акцёрскім майстэрствам. Вобраз творчай асобы, які стварыла іх маці, з'яўляецца надзейным маяком у іх жыцці.


1. *Булгарын, Ф.* Успаміны / Ф. Булгарын // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антаневіч, навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск, 2013. – С. 70–76.

2. *Капилов, А. Л.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск : ИСЗ, 2000. – 144 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ